Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 278 (347)
АЎТОРАК
3
СНЕЖНЯ
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СВОЕЧАСОВА АДРАМАНТАВАЦЬ ТРАКТАРЫ

Машынна-трактарныя станцыі нашай вобласці заканчваюць сельскагаспадарчы год з нядрэннымі паказчыкамі. Сваім машынна-трактарным паркам яны аказалі маладым калгасам велізарную дапамогу ў паспяховым правядзенні веснавой сяўбы, уборкі ўраджаю, ворыва зябліва і сяўбы азімых.

Рад МТС значна перавыканалі планы трактарных работ. Так, Свіслацкая машынна-трактарная станцыя план трактарных работ у пераводзе на мяккае ворыва выканала на 139,1 процанта, Парэцкая — на 116,1 процанта, Скідэльская — на 112,2 процанта, Чыжаўская — на 109,2 процанта, Граеўская — на 108,3 процанта і т. д.

Зараз машынна-трактарны парк МТС стаў на рамонт. Асенне-зімовы рамонт трактараў і сельскагаспадарчых машын з'яўляецца важнейшым дзяржаўным мерапрыемствам. Перад кожнай МТС, раённымі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі, зямельнымі органамі стаіць надзвычай адказная задача. Прадстаіць выдатна падрыхтаваць да веснавой сяўбы трактарны парк і сельскагаспадарчыя машыны. Ад таго, наколькі добраякасна будуць адрамантаваны сельгасмашыны і трактары, залежыць паспяховае правядзенне веснавой сяўбы і ўсіх сельскагаспадарчых работ будучага года, поспех барацьбы за атрыманне высокага ўраджаю.

Вось чаму рамонту трактараў партыя і ўрад надаюць такое велізарнае значэнне.

Для таго, каб узорна падрыхтаваць трактары да вясны, ад дырэктараў машынна-трактарных станцый патрабуецца па-большэвіцку арганізаваць рамонт, правільна расставіць рабочую сілу. Каб дабіцца максімальнага павышэння прадукцыйнасці працы на рамонце, трэба правільна арганізаваць працу — гэта значыць рамонтныя работы праводзіць па раней складзенаму плану.

Згодна плана, у IV квартале МТС павінны адрамантаваць капітальным і бягучым рамонтам 78 трактараў. Аднак ход рамонту па вобласці нездавальняючы. На 1 снежня адрамантавана 20 трактараў. Асобныя машынна-трактарныя станцыі рамонт пачалі арганізавана і своечасова. Скідэльская МТС павінна адрамантаваць бягучым рамонтам 2 трактары і адзін капітальна. План бягучага рамонту перавыканан — адрамантавана 4 трактары. Поўнасцю выканала квартальны план бягучага рамонту Беластоцкая машынна-трактарная станцыя.

Побач з гэтым рад машынна-трактарных станцый рамонту не арганізавалі. Так, Дамбраўская МТС павінна адрамантаваць 2 трактары бягучым рамонтам і адзін капітальна. Да гэтага часу тут да рамонту яшчэ зусім не прыступілі. Зрываецца рамонт трактараў і ў Спядаўскай МТС. Дырэктар МТС тав. Ваверыс рамонтам не займаецца. Тут яшчэ не закончана нават майстэрня, не глядзячы на тое, што тэрмін заканчэння будаўніцтва даўно прайшоў.

Капітальны рамонт трактараў павінна рабіць Беластоцкая машынна-трактарная майстэрня. Але будаўніцтва яе не закончана. Дырэктар машынна-трактарнай майстэрні тав. Фішкін неаднаразова заяўляў, што майстэрня будзе хутка пабудавана. Аднак словы яго далёка разыходзяцца з сапраўднасцю. Механічны цэх, у якім вытвараюцца выпрабаванні матораў, невядома калі будзе закончан. Прывезеныя ў МТМ трактары стаяць у чаканні заканчэння будаўніцтва механічнага цэха.

Немалаважнае значэнне мае культурна-бытавое абслугоўванне рабочых-рамонтнікаў. Абавязак дырэктараў МТС — праявіць сапраўды большэвіцкія клопаты аб падборы кадраў рамонтнікаў, падрыхтаваць інтэрнаты, сталовыя. Між тым па арганізацыю гэтай справы звярачваюць увагу не ва ўсіх машынна-трактарных станцыях.

Паспяховае правядзенне рамонту рашае правільная арганізацыя працы. Неабходна добра ўпарадкаваць вытворчы працэс, наладзіўшы паток дэталей і вузлоў ад станка да станка, ад аднаго рабочага да другога. У кожнай майстэрні трэба прымяніць прасцейшую механізацыю рамонтных работ, гэта значна павысіць прадукцыйнасць працы і якасць рамонту.

Неабходна прымяняць брыгадна-вузлавы метад рамонту. Гэты метад апраўдаў сябе на практыцы. Ён ліквідуе абязлічку, дае магчымасць працуючаму на рамонце павышаць кваліфікацыю, эканоміць сродкі. У гэтай справе выключная роля належыць механіку. Ён непасрэдна адказвае за ўпарадкаванне тэхналагічнага працэса і за якасць рамонту.

Асаблівая ўвага павінна быць звернута дырэктарамі і механікамі МТС на якасць рамонту. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня, 10 і 17 ліпеня далі ў рукі дырэктараў МТС магутныя сродкі барацьбы з прагульшчыкамі, дэзарганізатарамі вытворчасці, з бракаробамі. Кожны трактар павінен быць адрамантаван толькі высокаякасна. Барацьба за выдатную якасць рамонту трактараў павінна спалучацца з далейшым умацаваннем працоўнай дысцыпліны сярод трактарыстаў.

Справа чэсці работнікаў МТС — разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва за своечасовае выкананне плана рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын. Трактарны парк павінен быць узорна падрыхтаваным да веснавой сяўбы.

Пачаліся заняткі ў чыгуначных, рамесленых вучылішчах і школах фабрычна-заводскага абучэння

★ ★ ★

Вучоба пачалася

Яшчэ з самага ранку 1-га снежня ажылі корпусы Беластоцкага чыгуначнага вучылішча. Звонкія галасы навучаючыхся запоўнілі доўгія карыдоры. На тварах юнакоў радаснае ўзбуджэнне. Яны з'ехаліся з Бельска, Валкавыска і іншых месц. Хутка падружыліся і дзеляцца між сабой сваімі думкамі і ўражаннямі.

Невялікая група юнакоў акружыла Мішу Цуканава. Для яго гэтыя корпусы не навінка. Тут яму некаторы час прышлося вучыцца ў школе ФЗВ. І як толькі быў выдан Указ аб стварэнні чыгуначных вучылішчаў, Міша напісаў заяву з просьбай залічыць яго ў групу памочнікаў машыністаў. Аб гэтай прафесіі ён марыць ужо даўно. Яго бацька патомствены чыгуначнік. Міша расказвае сабраўшымся, якія прафесіі будуць тут, у чыгуначным вучылішчы.

Усё больш і больш юнакоў уключаецца ў задушэўную гутарку.

Першы дзень у вучылішчы! Гэта адчуваецца па ўсяму: і па любоўна ўпрыгожаных корпусах, і па бадзёрых галасах навучаючыхся.

Зігмунд Скаўронскі з станцыі Шэпетова сюды прышоў разам з сваім братам Янам, які навучаецца на курсах памочнікаў машыністаў. Яны абодва парашылі набыць адну і тую-ж кваліфікацыю.

У вытворчых цэхах усё падрыхтавана да сустрэчы першага папаўнення. Там, дзе будуць займацца слёсары і паравознікі, у рад расстаўлены афарбаваныя цыскі. Усюды парадак і чыстата. У такарным аддзяленні стаяць чысценькія станкі.

* * *

Сход, прысвечаны пачатку навучальнага года, адкрыў дырэктар чыгуначнага вучылішча тав. Фёдараў. Ён гаворыць пра вялікае значэнне выданага Указа аб стварэнні чыгуначных вучылішчаў, пра задачы вучняў у авалоданні прафесіямі, пра распарадак у вучылішчы.

Выступае вучань вучылішча Барыс Тарасаў. Яго прамова кароткая. Ён абавязуецца вучыцца толькі на «выдатна».

Загадчык навучальнай часткі тав. Пермякоў дакладвае аб распарадку работы, аб вучэбным плане, аб размеркаванні вучняў па групах. На гэтым сходзе выступіў таксама сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Ефройкін, які вітаў вучняў з пачаткам навучальнага года і пажадаў ім паспяховай вучобы.

* * *

У 6 гадзін 30 мінут раніцы раздаўся званок. Вучні хутка ўсталі і вышлі на 10-мінутную фізкультурную зарадку. Затым прывялі ў парадак свой туалет, заслалі ложкі.

Пасля снедання вучэбныя пакоі запоўніліся вучнямі. Некаторыя групы прыступілі да вытворчага абучэння, іншыя — да акадэмічных заняткаў.


Жыва праходзяць заняткі ў класе, дзе вучыцца група будучых памочнікаў машыністаў. Ідзе лекцыя фізікі. Выкладчык тав. Лумскі расказвае аб фізічных з'явах, задае асобныя пытанні. Вучні праяўляюць вялікую актыўнасць.

Актыўна праходзяць заняткі і ў іншых групах.

Трэба таксама адзначыць, што ў першыя дні вучобы адчувальна сказваецца недахоп у пардыхтоўцы чыгуначнага вучылішча да заняткаў. Да гэтага часу, напрыклад, не гатова яшчэ сталовая. Гэта выклікае затрымку з пачаткам нармальнай вучобы. Так было 2 снежня, калі заняткі пачаліся пазней устаноўленага часу.

Неабходна ў бліжэйшыя-ж дні ліквідаваць недахопы, якія перашкаджаюць у вучобе ў чыгуначным вучылішчы.

І. Давыдаў.



Першы дзень практычных заняткаў у Саколкаўскай школе ФЗА.
На здымку: сталярны майстар школы т. Банчэўскі А. А. паказвае прызыўнікам, як трымаць пілу.

Фота А. Сапіра.

У Гродненскім рамесленым вучылішчы

1 снежня, згодна ўказання начальніка Ўпраўлення працоўных рэзерваў, у Гродненскім рамесленым вучылішчы адбыўся агульны сход вучняў. Даклад аб значэнні працоўных рэзерваў зрабіў сакратар гаркома комсамола тав. Кузьмін. Затым выступілі вучні Ціханенка, Красільшчыкаў, Банькоўскі. Вучань Банькоўскі ў сваім выступленні сказаў:

— Мы дзякуем партыю, урад і асабіста таварыша Сталіна за тое, што яны па-бацькоўску клапоцяцца аб совецкай моладзі. На клопаты партыі і совецкага ўрада мы адкажам выдатнай вучобай і ўзорным авалоданнем сваёй справы.

Усе вучні з нецярплівасцю чакалі таго часу, калі ім пакажуць цэхі, варштаты.

Учора адчыніліся дзверы памяшкання рамесленага вучылішча. Жыццерадасныя, шчаслівыя юнакі знаёміліся з вучэбным корпусам, майстэрняй, інструментамі. Майстар знаёміў вучняў з рабочым месцам, з рэжымам работы, унутраным распарадкам дня.

Механічны цэх.

— Глядзелі, колькі машын тут?— пытае вучань Іосіф Бапа. — Усе яны не падобны адна на другую.

Майстар раз'ясняе вучням:

—Гэта фрэзерны станок, а гэта фрэзер-універсальны, а вось і стругальны станок.

—Самі будзем рабіць такія станкі? — запыталі вучні.

— Так, будзеце рабіць, — адказвае майстар па такарнай справе тав. Рабейка.

Сярод групы вучняў знаходзяцца Сігізмунд Ярашэвіч, Анатолій Філаменка і іншыя. Бацька Сігізмунда слёсар дэпо Гродна. Сігізмунд займаўся ў шостым класе 6-й няпоўнай сярэдняй школы.

— Я жадаю пайсці вучыцца на токара, — сказаў аднойчы Сігізмунд свайму бацьку.

— Ну што-ж, сынок, ідзі, ідзі па шляху свайго бацькі.

Учора вучні школы ўпершыню не толькі пачулі, але і завучылі такія рэчы, як пярэднюю і заднюю бабкі, стаціцу, супарт, маленькія і вялікія выступы для пераключэння хуткасцей.

Атрымаўшы малаткі і рашпілі ў інструментальнай, вучні — будучыя слёсары пачалі распілоўваць зажатыя ў цісках кавалкі дрэва. Рукі ў іх няўпэўнена трымаюць рашпіль. Няспритна завінчваюць ціскі. Майстар па слясарнай справе тав. Градзітор тлумачыць ім, як трэба стаяць каля ціскоў.

Сярод будучых слёсараў — дзеці калгаснікаў, рабочых, сялян-беднякоў. Генрых Загажэўскі — сын чыгуначнага абходчыка станцыі Парэчча, Васіль Хвайніцкі — сын селяніна-бедняка з вёскі Бершта, Парэцкага раёна, піонер Пётр Клячко — сын рабочага вяровачнай фабрыкі.

У сталярным цэху ручной пілой навучаліся распілоўваць дошкі. Праведзены заняткі па тэорыі.

Г. Лупсякоў.

Не падрыхтаваліся да заняткаў

2-га лістапада ў Ломжынскай школе ФЗА будаўнікоў праведзен арганізацыйны сход. Прызыўнікі азнаёміліся з праграмай і ўнутраным распарадкам.

Неабходна адзначыць, што правядзенне тэарэтычных заняткаў тармозіцца непадрыхтаванасцю памяшкання школы, якое падрыхтавана толькі на 50 процантаў. Падабраны і зацверджаны вопытныя майстры, але ў школу яны пакуль яшчэ не прыбылі. Няма таксама неабходных інструментаў для абучэння. Інтэрнат не падрыхтаван для поўнага размяшчэння прызыўнікоў. Нехапае ложкаў, матрацаў, прасцыней, коўдраў. Прыбыўшая моладзь была змешчана ў агульным пакоі.

Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што дырэктар школы т. Ліўшыц безадказна адносіцца да даручанай яму справы.

П. Грышчанка.

Памяці Сергея Міронавіча Кірава

30 снежня на 4 тэкстыльным камбінаце горада Беластока адбыўся ўрачыста-жалобны сход, прысвечаны светлай памяці Сергея Міронавіча Кірава. На сходзе прысутнічала 200 чалавек.

Даклад аб жыцці і рэволюцыйнай дзейнасці Сергея Міронавіча зрабіў тав. Сытоў.

У прынятай рэзалюцыі рабочыя камбіната ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па наладжванню абароннай работы на камбінаце і шырэйшаму разгортванню соцыялістычнага спаборніцтва, поўнасцю выканаць гадавы план да дня выбараў — 15 снежня.

С. Цобіна.

* * *

Учора ў актавым зале Беластоцкага педінстытута адбыўся мітынг студэнтаў, прафесараў і выкладчыкаў, прысвечаны памяці Сергея Міронавіча Кірава.

Прысутнічала 150 чалавек.

Даклад аб жыцці і дзейнасці тав. Кірава зрабіла комсорг ЦК ВЛКСМ тав. Шульман. Яна расказала прысутным аб сустрэчах студэнтаў Ленінграда з Сергеем Міронавічам, калі ён працаваў у Ленінградзе.

В. Юдо.

* * *

ЛЕНІНГРАД. На вуліцах і плошчах Ленінграда развіваюцца сцягі, апавітыя жалобнай каймой. Працоўныя горада шануюць памяць незабыўнага Сергея Міронавіча Кірава.

У прасторным зале Дома культуры імені Максіма Горкага ўвечары адбыўся шматлюдны сход працоўных Кіраўскага раёна. З глыбокай увагай была выслухана прамова аб жыцці і рэволюцыйнай дзейнасці палкага трыбуна рэволюцыі.

Вечары, прысвечаныя памяці С. М. Кірава, адбыліся таксама і ў іншых раёнах горада.

Музей С. М. Кірава да 5 гадзін дня наведала каля 3 тысяч чалавек. У Дзяржаўнай філармоніі была выканана сімфонія Мурадэлі, прысвечаная С. М. Кіраву.

(«Правда»)

ПАВЕДАМЛЕННЕ

4 снежня, у 6 гадзін 30 мінут вечара, на Совецкай плошчы адбудзецца агульнагарадскі мітынг працоўных горада Беластока, прысвечаны IV гадавіне Сталінскай Канстытуцыі.

Калоны працоўных прыбываюць на плошчу да 6 гадзін вечара.

Беластоцкі гарком КП(б)Б.

Па Совецкай краіне

ШКОЛА ПА ВЫВУЧЭННЮ ФІНСКАЙ МОВЫ

ПЕТРАЗАВОДСК. У гарадах і раёнах Карэла-Фінскай ССР пры партыйных камітэтах для партыйных, совецкіх і гаспадарчых работнікаў арганізаваны школы па вывучэнню фінскай мовы.

У горадзе Суоярві ў школе займаюцца 30 чалавек. Заняткі адбываюцца рэгулярна два разы ў тыдзень па 4 гадзіны. У Петразаводску фінскую мову вывучаюць 500 чалавек, у Кандапожскім раёне праведзена ўжо 5 заняткаў гуртка, у Заонежскім — 3 заняткаў.

ПЕРАДАВЫЯ ЛЮДЗІ

НАРВА. Дастойных людзей пасылаюць працоўныя Нарвы ва ўчастковыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР.

Работніцы суконнай фабрыкі аднагалосна выдзелілі ва ўчастковую камісію перадавую жанчыну Совецкай Эстоніі Марыю Серову. У члены камісіі працоўныя выдзелілі таксама рабочага Крэнгольмскай мануфактуры тав. Лейцігер, тэкстыльшчыцу Велья і іншых лепшых сваіх прадстаўнікоў.



Будынак канцэртнага зала імені Чайкоўскага на плошчы Маякоўскага ў Маскве.
Фота Н. Кубеева. Фота ТАСС

ПРЫЁМ У СПЕЦЫЯЛЬНУЮ ШКОЛУ ВАЕННА-ПАВЕТРАНЫХ СІЛ

У першую Маскоўскую спецыяльную сярэднюю школу ваенна-паветраных сіл падана ўжо звыш 600 заяў.

Пачала працаваць медыцынская камісія.

Паступаючыя ў школу маюць выдатныя і добрыя ацэнкі па ўсіх прадметах. Выдатнікамі сваіх школ з'яўляюцца Леанард Юмашаў—сын Героя Совецкага Саюза А. Б. Юмашава, Анатолій Сіманаў і іншыя.

Многія з падаўшых заявы навучаліся ў авіямадэльных гуртках і аэраклубах Асоавіяхіма.

Першая Маскоўская спецыяльная сярэдняя школа ваенна-паветраных сіл будзе змяшчацца ў выдатным будынку на Шлюзавай-Набярэжнай.

НОВАЕ СЯМЕЙСТВА СЫСУНОЎ

АЛМА-АТА. Два годы назад удзельнікі аб'еднанай экспедыцыі Сярэднеазіяцкага і Казахскага ўніверсітэтаў знайшлі ў пустыні Бет-Пак-Дала невядомага зоалогам звярка мышына-шэра-плямістай афарбоўкі. Аддалёна ён напамінаў распаўсюджаную ў Казахстане «лясную соню». Працяглае вывучэнне паказала, што гэты звярок належыць да невядомага да гэтага часу сямейства сысуноў. Блізкіх родзічаў у фауне СССР у яго няма. Новае сямейства сысуноў названа «Селевініідзе» у памяць памёршага даследчыка пустыні Бет-Пак-Дала В. А. Селевіна.

12 МІЛЬЁНАЎ МАНДАРЫНАЎ ЗА РЭЙС

У Чорным моры пачалася масавая транспартыроўка мандарынаў. У апошнім рэйсе з Батумі ў Одэсу экіпаж цеплахода-экспрэса «Грузія» дабіўся рэкорднай пагрузкі цытрусавых: каманда прыняла на борт 119 вагонаў мандарынаў — каля 12 мільёнаў пладоў.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Вяліка-Бераставіцкай выбарчай акругі № 62, Крынкаўскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Нікалая Андрэевіча НІШЧЫКА!

★ ★ ★

Нікалай Андрэевіч Нішчык

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).


У памяшканні, дзе цяпер абласны зямельны аддзел, знаходзіўся раней ваяводскі зямельны аддзел. Тут сядзелі буйныя чынушы, якія стаялі на варце інтарэсаў 534 памешчыкаў, 1.226 асаднікаў і іншых эксплаататараў.

З устанаўленнем совецкай улады зямля перадана фактычным яе гаспадарам—працоўным сялянам. Беластоцкі зямельны аддзел за год совецкай улады з дапамогай партыйных і совецкіх органаў правёў вялікую работу. У вобласці растуць і квітнеюць 163 калгасы, 8 соўгасаў, якія наглядна дэманстрыруюць перавагу соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Тысячы батракоў і беднякоў атрымалі зямлю з рук совецкай улады.

У абдза працуюць сапраўдныя народныя прадстаўнікі, для якіх інтарэсы працоўнага сялянства вышэй усяго. Сын беларускага батрака, комуніст Нікалай Андрэевіч Нішчык кіруе Беластоцкім абласным зямельным аддзелам. Яго добра ведаюць сяляне нашай вобласці. На сумесным сходзе калгаснікаў сельгасарцелі імені Калініна і сялян вёскі Берастaвіца, Крынкаўскага раёна, кандыдатура тав. Нішчыка была аднагалосна вылучана ў дэпутаты абласнога Совета.

Нікалай Нішчык—дастойны кандыдат. Усё яго простае і скромнае жыццё было аддана на дабро працоўнага народа. Ён нарадзўся ў 1905 годзе ў бядняцкай вёсцы Дабраваткі, Смалявіцкага раёна, недалёка ад Мінска. Нікалаю ўдалося скончыць двухкласную школу. І на гэтым яго «навука» скончылася. Памёр бацька, асталася маці старая з сястрой. 16-гадовы Нікалай становіцца «гаспадаром» сям'і. Трэба было на сваіх маладых плячах вынесці ўвесь цяжар сямейных клопатаў. Вялікія цяжкасці загартавалі волю Нікалая. Землякі, ведаючы яго, як чэснага і працавітага юнака, пасылаюць яго ў сельскі Совет. Нікалай у сваёй вёсцы праводзіць у жыццё ўсе мерапрыемствы совецкай улады. Па яго ініцыятыве пабудавалі сельскую школу, ён арганізоўвае драматычны гурток, ставіць спектаклі, праводзіць гутаркі.

У 1927 годзе Нікалай Нішчык працуе ўжо сакратаром сельсовета.



У гэтым годзе ён уступае ў комсамол. Комсамолец Нікалай Нішчык арганізоўвае ў 1928 годзе першы ў Смалявіцкім раёне калгас. Яго актыўная грамадска-палітычная работа разгортваецца ўсё шырэй і шырэй. З 1929 года — ён кандыдат партыі і выбіраецца старшынёй сельсовета. Усе сілы ён аддае на ўмацаванне першага ў сельсовеце калгаса. У 1930 годзе ён уступае ў комуністычную партыю.

Нікалай Нішчык прайшоў сапраўдную палітычную школу барацьбы з кулацтвам. Ён паказаў сябе адданым комуністам, верным партыі Леніна—Сталіна. У жніўні 1931 года тав. Нішчык вылучаецца загадчыкам Смалявіцкага райземаддзела. Загадчыкам райза ён працуе бесперапынна да снежня 1936 года. Ён чэсна і нястомна працаваў над арганізацыйна-гаспадарчым умацаваннем калгасаў, яго ў раёне ведалі ўсе — ад малога да старога. Тав. Нішчык працуе потым у якасці намесніка старшыні райвыканкома. Для ўмацавання Смалявіцкай МТС ён назначаецца дырэктарам. За кароткі час сваёй работы ён дабіваецца таго, што МТС займае адно з першых месц у рэспубліцы. Дырэктарам перадавой МТС тав. Нішчык працаваў да кастрычніка 1939 года.

У кастрычніку 1939 года тав. Нішчыка ЦК КП(б)Б камандыруе ў г. Гродна. Тут ён працуе намеснікам старшыні Часовага ўпраўлення, хутка арыентыруецца ў новай абстаноўцы. Сустракаецца з тысячамі людзей, вырашае сотні вялікіх і малых спраў.

З 10 снежня Нікалай Андрэевіч Нішчык—на пасту начальніка Беластоцкага абласнога зямельнага аддзела. З законнай гордасцю ён расказвае аб вялікіх падзеях, якія адбываюцца ў вызваленай вёсцы. Сталінскія клопаты аб працоўным сялянстве вызначаюцца мноствам лічбаў. 24 машынна-трактарныя станцыі абслугоўваюць калгасы вобласці. Былыя батракі і беднякі, якія аб'ядналіся ў калгасы, сталі на шлях заможнага і шчаслівага жыцця, аб якім яны доўга марылі. Аб калгасах імені Сталіна, Заблудаўскага раёна, імені Варашылава, Скідэльскага раёна, і многіх іншых вядома за межамі нашай вобласці.

Тав. Нішчык расказвае, што ў абласны зямельны аддзел прыязджаюць многія калгаснікі. Аднаасобнікі адчуваюць сябе поўнымі гаспадарамі новага жыцця, смела ставяць перад абдза новыя пытанні, уносяць рад каштоўных прапаноў, якія накіраваны на паляпшэнне работы зямельных органаў.

Кандыдат у дэпутаты абласнога Совета Нікалай Андрэевіч Нішчык апраўдае вялікае давер'е сваіх выбаршчыкаў.

Г. Майсееў.

Выбаршчыкі Лунненскай выбарчай акругі № 85, Скідэльскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Анну Сяргееўну МІЛАШЭВІЧ!

★ ★ ★

Анна Сяргееўна Мілашэвіч

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

Маленькай Анютцы было чатыры годы, калі бацьку яе цар забраў на вайну. Яна часта бегала з іншымі дзецьмі да чыгункі глядзець, як ішлі эшалоны салдат на фронт. І маці хадзіла з ёй да чыгункі, гаварыла:

— Во, яшчэ паехалі салдаты, і татка з імі. Весела ім, гармонік, чуеш, як грае.

— А чаму-ж ты, мама, плачаш, калі весела?

— А таму, што ты ўсё плачаш, вось супакойся, а то зноў плакаць буду.

Скора і ў іх вёсцы Чарлёнкі стаў чуцен грукат гармат. Жыхары надняліся з родных месц, паехалі і пайшлі ў Цэнтральную Расію. Тысячы бежанцаў запрудзілі ўсе дарогі, плакалі, няшчасныя, не бачачы перад сабой ніякай надзеі. Маці і брат Анюты заехалі аж у Крым. Там то батрачылі, то шукалі іншых заработкаў. З вайны да іх прыехаў бацька, папрацаваў нядоўга на пілоўцы дошак, ды рушыла яму свая зямля, пакінутая на радзіме хата. Сабраўся ехаць паглядзець, сеў на буферы вагона, прастудзіўся, захварэў і памёр.

Паехала маці на радзіму з дзецьмі, пахавала бацьку, пачала абзаводзіць гаспадарку. Прадала стадолу — купіла каня, прадала швейную машыну — набыла карову, хату сяк-так збудавала. Але не далі падымацца сялянам-беларусам польскія паны, якія акупіравалі Заходнюю Беларусь. Крывавыя каты беларускага народа адразу-ж пачалі гнусную расправу з тымі, хто пратэставаў супроць панскага прыгнёту, супроць апалячвання і аграбления беларускага сялянства.

Цяжкія падаткі, штрафы і арышты, здзекі і катаванні польскай паліцыі выклікалі абурэнне, прабуджалі класавую рэволюцыйную нянавісць сялянства супроць польскіх улад. Лепшыя, чэсныя і смелыя сыны беларускага народа выступалі на барацьбу. З вёскі Чарлёнкі Сямён Мілашэвіч, Міхаіл Шывілька, Грыгор Барашка, Георгій Совец, з імі Антон Майсееў з суседняй вёскі разам працавалі ў падпольнай ячэйцы КПЗБ.

Скора пра падпольную ячэйку даведаліся мясцовыя багацеі і канфідэнты. Яны даносілі дэфензіве на падпольшчыкаў, якія тайком



збіраліся на свае сходы, гаварылі сялянам праўду аб Совецкім Саюзе. Адразу-ж прыходзіў солтыс, з'яўляўся паліцыянт да двара западазронага і знаходзіў прычэпку, штрафаваў на месцы за тое, што плот паламаны, што камін не пабелены, што карова на вуліцы набрудзіла.

Правакатары выдалі Грыгора Барашку, калі падпольная арганізацыя паслала яго ў Вільню за комуністычнымі лістоўкамі. Калі ён варочаўся з пакункам літаратуры, каля Гродна яго чакала на дарозе таксоўка сыскной паліцыі. Назаўтра прышлі паліцыянты да Георгія Соўца.

— Апранайся, марш з намі!

Тут-жа, у яго ў хаце, пры ўсіх на яго надзелі кайданы, павялі ў пастарунак. Да поўсмерці збілі Грыгора і Георгія, але яны не выдалі таварышоў, не сказалі пра арганізацыю. Георгія Соўца, роднага брата Анны Мілашэвіч, асудзілі на тры годы турмы. Яго душылі страшэннымі катаваннямі. На дошчэ каты ўлілі яму два літры карасіну з воцатам. Атрута спаліла яму нутро, катаванні знясілілі яго. Але праз паўтара годы прышло вялікае вызваленне, прышла Чырвоная Армія, вызваліла палітэняволеных. Георгій Совец пехатой пайшоў з гродненскай турмы ў вёску Чарлёнкі, што за Скідэлем. Не вытрымаў яго арганізм зверскіх катаванняў, памёр Георгій, а перад смерцю гаварыў:

— Хоць-бы пяць гадочкаў пражыць пры совецкай уладзе, паглядзець на тое шчасце, за што я змагаўся і за што мяне гады замучылі.

Гэта шчасце ўбачылі, зажылі шчаслівым жыццём вызваленыя працоўныя заходніх абласцей Совецкай Беларусі. Сястра Георгія — Анна Мілашэвіч, былая батрачка, якая перажыла столькі гора і трывогі, шчасліва жыве ў калгасе імені Варашылава, Русінаўскага сельсовета. Яна лепшая работніца, сваім прыкладам вяла за сабой астатніх, яна не шкадуе сіл на дабро калгаса, выкрывае паклёп і хлусню ворагаў совецкага ладу ў вёсцы.

Яе муж Сямён Міхайлавіч Мілашэвіч — першы ўступіў у калгас, яго выбралі калгаснікі брыгадзірам. Разам з старшынёй калгаса Міхаілам Шывілька ён даў адпор варожым спробам разладзіць дружнае жыццё калгаснікаў. Шчасліва і заможна зажылі калгаснікі ў калгасе імені Варашылава. Ужо ў першы год калгаснікі атрымліваюць па 8 кілограмаў хлеба на кожны працадзень, па 25 кілограмаў бульбы. Сем'і чэсных калгаснікаў атрымаюць столькі дабра, колькі яны век не бачылі.

Калгаснікі вылучылі Ану Мілашэвіч сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Гэта высокая чэсць, якую аказаў народ сваёй вернай і простай дачцы, узрадавала Анну Сяргееўну вялікай радасцю, яна выказвае шчырую падзяку за высокае давер'е. Яна горача дзякуе за шчаслівае жыццё магутнай совецкай уладзе, вялікай комуністычнай партыі і лепшаму другу працоўных, роднаму Сталіну.

Выбаршчыкі Лунненскай выбарчай акругі, Скідэльскага раёна, аказалі вялікае давер'е чэснаму і вернаму чалавеку, будаўніку калгаснага жыцця, лепшай калгасніцы Анне Сяргееўне Мілашэвіч. Яна гэта давер'е заслужыла.

І. Клінаў.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

121. Па акрузе **№3** зарэгістрыраван Владзімір Якаўлевіч **Кутылоўскі,** 1900 года нараджэння, беспартыйны, рабочы каўбаснага цэха мясакамбіната, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых мясакамбіната.

122. Па акрузе **№ 6** зарэгістрырaвана Люба Мордухаўна **Зарэмбская,** 1896 года нараджэння, беспартыйная, работніца 3-га камбіната, вылучаная калектывам рабочых 3-га камбіната.

123. Па акрузе **№ 7** зарэгістрырaвана Галіна Іосіфаўна **Петрак,** 1911 года нараджэння, беспартыйная, лабарантка 3-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам гэтага-ж камбіната.

124. Па **10-й** выбарчай акрузе зарэгістрырaвана Браніслава Адамаўна **Фрэйндорф,** 1897 года нараджэння, член ВКП(б), намеснік адказнага рэдактара газеты «Вольна праца» (польскае выданне), вылучаная калектывам работнікаў рэдакцыі газеты «Вольная праца».

125. Па акрузе **№ 11** зарэгістрырaвана Ядвіга Аўгустаўна **Піўніцкая,** 1890 года нараджэння, беспартыйная, снавальшчыца ісгужкавай фабрыкі, вылучаная калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых гэтай фабрыкі.

126. Па акрузе **№ 12** зарэгістрырaвана Ядвіга Антонаўна **Сенкевіч,** 1897 года нараджэння, беспартыйная, начальнік аддзела тэхнічнага кантролю на абсацавай фабрыцы, вылучаная калектывам рабочых гэтай фабрыкі.

127. Па акрузе **№ 20** зарэгістрырaвана Марыя Георгіеўна **Пацэвіч,** 1905 года нараджэння, беспартыйная, дырэктар школы № 27, вылучаная калектывам настаўнікаў і служачых 15, 30 і 27-й школ і калектывам горана.

128. Па акрузе **№ 25** зарэгістрыраван Станіслаў Ізідаравіч **Дзялек,** 1908 г. нараджэння, беспартыйны, кладаўшчык 2-й гарбальніцы, вылучаны калектывам работнікаў бальніцы.

129. Па акрузе **№ 29** зарэгістрыраван Франц Войцэхавіч **Менто,** 1899 г. нараджэння, беспартыйны, рабочы півабезалкагольнага камбіната, вылучаны калектывам рабочых і служачых гэтага-ж камбіната.

130. Па акрузе **№ 34** зарэгістрырaвана Марыя Нікалаеўна **Васільева,** 1896 г. нараджэння, беспартыйная, інструктар прадзільнага цэха 5-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам 5-га тэкстыльнага камбіната.

131. Па акрузе **№ 41** зарэгістрырaвана Елена Іосіфаўна **Палтарак,** 1893 г. нараджэння, беспартыйная, варсаўшчыца 15-й тэкстыльнай фабрыкі, вылучаная калектывам 15-й тэкстыльнай фабрыкі.

132. Па акрузе **№ 44** зарэгістрыраван Міхаіл Сцяпанавіч **Ермакоў,** 1904 г. нараджэння, член ВКП(б), упаўнаважаны камісіі партыйнага кантроля пры ЦК ВКП(б) па Беластоцкай вобласці, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых тэкстыльнага камбіната № 4.

133. Па акрузе **№ 48** зарэгістрыраван Якаў Іоселевіч **Плонскі,** 1897 г. нараджэння, беспартыйны, ткач 4-га тэкстыльнага камбіната, вылучаны калектывам 4-га камбіната.

134. Па акрузе **№ 72** зарэгістрыраван Віктар Якаўлевіч **Канопка,** 1896 г. нараджэння, беспартыйны, прараб аддзела капітальнага будаўніцтва 1-га тэкстыльнага камбіната, вылучаны калектывам таго-ж камбіната.

135. Па акрузе **№ 76** зарэгістрырaвана Ізабела Андрэеўна **Якубоўская,** 1910 г. нараджэння, беспартыйная, нарміроўшчыца 1-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам 1-га тэкстыльнага камбіната.

136. Па акрузе **№ 95** зарэгістрыраван Сямён Пятровіч **Мілоў,** 1908 г. нараджэння, член ВКП(б), сакратар Беластоцкага гаркома КП(б)Б, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых 5-га тэкстыльнага камбіната.

137. Па акрузе **№ 98** зарэгістрырaвана Яніна Фомаўна **Петручук,** 1913 г. нараджэння, беспартыйная, ткачыха плюшавай фабрыкі, вылучаная калектывам плюшавай фабрыкі.

138. Па акрузе **№ 100** зарэгістрырaвана Аляксандра Іванаўна **Максімовіч,** 1907 г. нараджэння, беспартыйная, ткачыха плюшавай фабрыкі, вылучаная калектывам плюшавай фабрыкі.

139. Па акрузе **№ 101** зарэгістрыраван Міхаіл Дзмітрыевіч **Кузняцоў,** 1904 г. нараджэння, член ВКП(б), сакратар гаркома КП(б)Б, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых плюшавай фабрыкі.

140. Па акрузе **№ 103** зарэгістрыраван Владзімір Аляксандравіч **Ольшэўскі,** 1904 г. нараджэння, беспартыйны, майстар цэха плюшавай фабрыкі, вылучаны калектывам гэтай-жа фабрыкі.

Сустрэча кандыдатаў у дэпутаты з выбаршчыкамі

Апраўдаю ваша давер'е

У чыгуначным клубе станцыі Старасельцы ажыўлена. Сюды сабраліся выбаршчыкі на сустрэчу з сваім кандыдатам у дэпутаты горпасялковага Совета тав. Лікта.

Тав. Лікта коратка, але выразна расказала сваім выбаршчыкам аўтабіяграфію і дзякавала за аказаную ёй чэсць.

— Мне ўжо 53 годы, — гаворыць яна, — і за ўвесь час свайго жыцця я не была такой шчаслівай, як сёння. Раней акрамя гора і галечы я нічога не бачыла. Да 16-і год працавала па найму. Нялёгкая была гэта праца. Часта прыходзілася хадзіць з пабоямі за малейшае непаслушэнства пані або паненцы.

Калі я трохі падрасла, зразумела, што так жыць далей немагчыма, што павінен прыйсці такі час, калі працоўны народ ўздыхне свабоднымі грудзьмі, вырвецца з кабалы і цемры. Я прымала ўдзел у забастоўках, за што была выслана з Беластока ў Гродна.

Нарэшце, збылася мая доўгачаканая мара. Чырвоная Армія падала нам брацкую руку дапамогі і вызваліла нас ад памешчыкаў і капіталістаў. Не гледзячы на мае 53 годы, я адчула сябе зусім маладой.

Мяне вылучылі кандыдатам у дэпутаты горпасялковага Совета. Дзякую вам, мае дарагія супрацоўнікі чыгуначнікі і выбаршчыкі нашай акругі, за аказанае мне вялікае давер'е! Абяцаю, што ваша давер'е я апраўдаю.

С. Смоляк.

Дастойны кандыдат

Граеўскі дом соцкультуры перапоўнен. Сюды сабраліся больш 400 выбаршчыкаў, каб сустрэцца з сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета—з тав. Сазонавым Аляксандрам Фёдаравічам.

Прысутныя з вялікай увагай слухалі прамову тав. Сазонава.

Ад выбаршчыкаў выступіў Ябко:

— Александр Фёдаравіч Сазонаў прайшоў шлях ад станка да дзяржаўнага дзеяча. Працоўныя вобласці добра ведаюць яго, як чулага і адданага работніка. Ён з чэсцю апраўдае давер'е народа. Я заклікаю ўсіх выбаршчыкаў нашай акругі ў дзень 15 снежня галасаваць за тав. Сазонава Аляксандра Фёдаравіча.

В. Гарбанёў.

КІРАЎ У АСТРАХАНІ

У канцы 1918 года XI армія, утрымліваўшая амаль увесь Каспійска-Каўказскі фронт ад белагвардзейцаў і інтэрвентаў, несла вялікія страты. Праціўнік, удвая перавышаючы яе колькасцю, выдатна ўзброены, цясніў нашы часці.

Змучаным, па сутнасці бяззбройным байцам XI арміі, было надзвычай цяжка стрымліваць націск ворага. Калі дадаць да ўсяго гэтага тое, што ў штабах сядзелі здраднікі і варожыя лазутчыкі — стаўленікі Іуды-Троцкага, то стане зусім ясным, у якім становішчы знаходзілася XI армія.

На дапамогу XI арміі В. І. Ленін і Я. М. Свердлоў пасылаюць вялікую ваенную экспедыцыю на чале з Сергеем Міронавічам Кіравым. Гэтая экспедыцыя везла снаражэнне, боепрыпасы, абмундзіраванне.

Як толькі экспедыцыя прыбыла ў Астрахань, Сергей Міронавіч адразу-ж выязджае ў Яш-Куль насустрач адступаючым часцям XI арміі. Тут ён асабіста арганізоўвае эвакуацыйныя пункты, лазарэты, санітарныя пасты, каб выратаваць паражоных эпідэмічнымі хваробамі чырвоных байцоў.

«Мы ведаем, — гаварыў Сергей Міронавіч, на адным з пленумаў Астраханскага горсовета, — што наша Астрахань мае значэнне для ўсёй рэспублікі, і мы павінны ўсімі сіламі і сродкамі абараняць край... Памятайце, што наша Астрахань з'яўляецца варотамі да багатых нафтай і хлебам месц».

Кіраў жалезнай рэволюцыйнай рукой наводзіць большэвіцкі парадак, ліквідуе і папярэджвае ў горадзе белагвардзейскія затаворы і мяцяжы. У часцях Чырвонай Арміі ён насаджае дух дысцыпліны, арганізаванасці, баявой адвагі.

Вакол Астрахані вырастаюць дзве лініі ўмацаванняў. Былі створаны заслоны на лініях Лагані, Джамбая ля Чорнага Яра і ля Кізляра. Задача заключалася, аднак, не толькі ў абароне горада, але трэба было і разграміць праціўніка. З рэшткаў XI арміі былі сфарміраваны 33, 34 стралковыя і 7 кавалерыйская дывізіі, якія сталі мужна змагацца з полчышчамі ворагаў. У цяжкія мінуты баёў, на самых небяспечных участках фронта заўсёды знаходзіўся Сергей Міронавіч, натхняючы байцоў на гераічныя подвігі.

Здраднік Іуда-Троцкі аддае загад аб здачы Астрахані, быццам-бы для «выраўнівання фронта». Кіраў не выконвае гэты загад і тэлеграфіруе В. І. Леніну. Владзімір Ільіч адказаў:

«Астрахань абараняць да канца».

У адказ на гэта Сергей Міронавіч сказаў вядомыя словы: «Пакуль у Астраханскім краі ёсць хоць адзін комуніст, вусце ракі Волгі было, ёсць і будзе совецкім». Гэты заклік палкага большэвіка стаў баявым сцягам усіх чырвоных байцоў XI арміі, усіх працоўных Астраханскага края.

І ўжо ў ноч на 30 ліпеня 1919 года чырвоныя войскі выбілі дзенікінскія часці з Владзіміраўкі і адцяснілі іх к Капусьціну Яру. У гэтым баі чырвоныя часці знішчылі конную брыгаду, два казацкіх палкі і белабандыцкі атрад у 500 шабляў.

Таленавіты палкаводзец, Сергей Міронавіч Кіраў згуртаваў і сцэментыраваў рады XI арміі, зрабіў яе боездольнай.

У кастрычніку 1919 года Чырвоная Армія пачала ажыццяўляць план таварыша Сталіна па разгрому Дзенікіна. У ім прыняла ўдзел і XI армія. Яна дралася разам з часцямі X арміі і дапамагала ёй узяць Царыцын. У сярэдзіне лістапада Сергей Міронавіч асабіста распрацаваў план па разгрому генерала Талстога ля Б. Маячнага і Нова-Красная. Гэтая аперацыя была бліскуча праведзена. Белыя былі разбіты і поўнасцю знішчаны. Часці Чырвонай Арміі захапілі 4 гідрапланы, 6 гармат, звыш 3000 вінтовак, 200.000 патронаў, 50 кулямётаў, тысячы палонных і масу іншых ваенных трафеяў.

1 снежня таварыш Кіраў данёс Леніну аб ліквідацыі белага астраханскага казацтва.

«Часці XI арміі спяшаюцца падзяліцца з Вамі рэволюцыйнай радасцю па выпадку поўнай ліквідацыі белага астраханскага казацтва».

3-га студзеня 1920 года X армія пры садзейнасці XI арміі звярнула совецкай рэспубліцы чырвоны Царыцын. Пасля гэтага XI армія грамiла Дзенікіна на Паўночным Каўказе. Уперадзе арміі ішоў яе баявы правадыр і кіраўнік, чалавек вялікага палкаводчаскага таленту, непахіснай мужнасці і рэдкай храбрасці і адвагі — Сергей Міронавіч Кіраў.

Чырвоная Армія будзе вечна памятаць светлы вобраз палкага трыбуна рэволюцыі Сергея Міронавіча Кірава. Байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, як і ўвесь совецкі народ, ніколі не злітуюцца над трацкісцка-бухарынскімі бандытамі за іх страшэннае зладзейства. Жыццё і барацьба Кірава—прыклад для нас, як трэба жыць, змагацца і перамагаць у славу нашай радзімы.

Ал. Окунеў.
Н. Кочкін.